***А.М. Макарэвіч***

# ЛІТАРАТУРНАЯ ПРАМОВА Ў ТВОРЧАСЦІ ЦЁТКІ

Артыкулы А. Пашкевіч “Да вясковай моладзі беларускай”, “Шануйце роднае слова”, “Аб душы маладзёжы”, “Да дзяўчатак” і інш. – гэта своеасаблівыя прамовы ў літаратурнай друкаванай форме.

“Да вясковай моладзі беларускай” – гэта своеасаблівая асветніцкая праграма часопіса “Лучынка”, які апублікаваў гэты і іншыя артыкулы А. Пашкевіч. У той жа час аўтар у ім звяртаецца з заклікам да беларускай моладзі:

“<...> *беларуская моладзь, прыгатуй сваё сэрца, душу і рукі да працы для роднага народа.*

*Пазнай <...>, – які ты можаш і які павінна даць атвет перад новым пакаленнем, што ідзе за табой і перад вякамі гісторыі.*

<...> *Гледзячы на цябе верыцца, што жыццё свайго не змарнуеш, што патрапіш пастаяць за долю свайго пакрыўджанага народа і працай штодзённай паложыш падваліны пад лепшую, яснейшую яго будучыню*” [2, 178].

У артыкуле “Шануйце роднае слова!” Цётка паглыбляе ідэю абароны роднай мовы дзеля захавання нацыі. Аб’ектамі звароту тут з’яўляюцца роднае слова і беларуская моладзь. У пачатку гэтай прамовы Цётка, звяртаючыся да роднага слова, канстатуе, што яно *“з матчыных вуст”*, што яно – неад’емная частка дзіцячай душы. Такая канстатацыя абвастрае далейшыя сведчанні, якія з’яўляюцца своеасаблівым абвінавачваннем тым, хто, забыўшы родную мову, *“выракся бацькоў і братоў сваіх” “дзеля карысці”*. У дадзеным выпадку Цётка апасродкавана



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

звяртае ўвагу на спрадвечны хрысціянскі матыў абароны чалавекам сваіх бацькоў, паважлівых адносін да іх. І тут назіраем не толькі ўскоснае выкарыстанне біблейскіх матываў аб шанаванні бацькоў дзецьмі (кн. "Зыход", раздзелы 20 (вершы 12, 21), 21 (вершы 15, 17)), але і сфарміраваных на іх падмурку народна-педагагічных прынцыпаў. Такая фактуальнасць гэтай часткі прамовы падводзіць да параўнання яе з неўміручым "Трэнасам" М. Сматрыцкага (1610). Апавядаючы пра гора маці-царквы, якую пакінулі народжаныя і выхаваныя ёю дзеці, М.Сматрыцкі выкарыстаў не толькі вядомую ў народзе форму плача-галашэння, але і пашыраную сярод народа хрысціянскую выснову *"бо пракляты Гоcпадам кожны, каторы пакідае яе* [маці. – А.М.] *ўчынкам і словам"* [1, 633]. Цётка, якая цікавілася гісторыяй культуры старажытнага перыяду, не магла не ведаць пра асаблівасці ўздзеяння такога хрысціянскага матыву на свядомасць чалавека, пра асаблівасці яго выкарыстання ў народнай педагогіцы і пра выхаваўчую выніковасць такога выкарыстання. Таму яна, закцэнтаваўшы ўвагу на праблеме абароны ўсяго роднага, што з'яўляецца сімвалам памяці пра бацькоў, пераходзіць да канстатацыі фактаў рэальнага жыцця: беларуская моладзь, пабыўшы *"між чужых людзей"*, пабачыўшы, як насміхаюцца там з роднай мовы, *"пачынае саромецца роднай мовы, свайго народа, сваёй радні"*. Моладзь пачынае забывацца пра беларускі народ. *"Чужых багоў прымаеце: чужую гутарку, звычаі, чужое імя"* [2, 180], – сведчыць Цётка. І тут зноў можна правесці паралель з высновамі, якія ўтрымліваюцца ў неўміручым "Трэнасе" М. Сматрыцкага: *"Сыны і дочкі мае, якіх спарадзіла я і выхавала, мяне пакінуўшы, пайшлі да той, каторая іх не выпакутавала, каб напоўніцу насыціцца з ейнай укармлёнасці"* [1, 629].

У Цёткі чытаем: *"Для сваіх вы прападаеце. Адны служаць чужым – бо свайго бога не маюць, бо ад вялікай грамады народнай адарваліся <...>. Другія – затым, што добрую плату даюць ім... Але няма такой заплаты, што дае забыццё ад здрады. Юдавы срэбнікі не ўцешаць іх, калі, змогшыся жыццём і няшчасцямі, захочуць яны знайсці спакой душы, сагрэць яе чыстай любоўю"* [2, 180].

Пасля такога папярэджання Цётка вызначае нацыянальна-гістарычную місію беларускай моладзі: *"На вас – моладзі – ляжыць вялікая павіннасць: развіваць далей родную мову, узбагачаць свой народ знаннем і культурай. Вы здабываеце навуку для сябе, дык дзяліцеся ёю з тымі, хто для вас цяжкай працай здабывае кусок хлеба. Толькі не кідайце роднай мовы: бо запраўды для свайго народа тады вы ўмерлі!*

*Мейце сілу і адвагу дзяржацца роднага слова. Мейце смеласць усюды галасна казаць па-свойму. І, гледзячы на вас, асмеляцца і іншыя"* [2, 180].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У выхаваўчай праграме Цёткі нацыянальныя кампаненты непарыўна звязаны з агульначалавечымі. На гэта звяртаецца непасрэдная ўвага, напрыклад, у артыкуле "Аб душы маладзёжы". Тут асветніца праз пытанне (*"Глядзіш на нашу моладзь і згадваеш: колькі з вас з часам ідэйна замрэ для грамадства?* [186]") і ілюстрацыі да яго канстатуе сумную рэальнасць: не ўсе з маладых людзей уздымуцца да разумення неабходнасці служэння найперш Бацькаўшчыне, інтарэсам яе народа. У той жа час, абапіраючыся на падмурак хрысціянскай маралі, яна заклікае моладзь развіваць *"ў сабе ўсе лепшыя зачаткі, якія ў душы яе змалку заложаны"* [186].

Для пісьменніцы важным было выклікаць у душы яе чытачоў жаданне зацікаўлена асэнсаваць балючыя нацыянальныя праблемы, далучыцца да іх вырашэння. І ў кантэксце такой нацыянальна-выхаваўчай праграмы зварот, прамова аказаліся для яе найбольш эфектыўнымі, а літаратурная іх форма і белетрызаваны змест садзейнічалі ўзнікненню ў свядомасці рэцыпіентаў жадання асэнсаваць сваё месца ў новых грамадскіх умовах. Гэта ж у сваю чаргу магло нарадзіць імкненне да актыўнай нацыянальна-грамадзянскай пазіцыі. Уся літаратурная, асветніцка-педагагічная дзейнасць А.Пашкевіч была накіравана якраз на дасягненне менавіта гэтай мэты.

## ЛІТАРАТУРА


1. Сматрыцкі М. Трэнас // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя. – Мінск, 2003.
2. Цётка. Выбраныя творы. – Мінск, 2001.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова